WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

3 ЛІСТАПАДА 2009 г.
АЎТОРАК
№ 208 (26566)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.


## СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

### Падпіска-2010

Паважаныя чытачы і падпісчыкі газеты «Звязда»! Выказваем вам вялікую ўдзячнасць за падтрымку найстарэйшага ў краіне, адзінага штодзённага беларускамоўнага выдання. Нагадваем, што ўжо пачалася падпісная кампанія на I паўгоддзе і 1-ы квартал 2010 года. Спадзяёмся, што чытацкая аўдыторыя «Звязды» не толькі застанецца стабільнай за кошт пастаянных падпісчыкаў, але і пашырыцца за кошт новых сяброў. Са свайго боку редакцыя будзе прыкладаць да гэтага ўсе намаганні: імкнуцца публікаваць штодня цікавыя і змястоўныя матэрыялы, заставацца праваднiком беларускамоўнага асяроддзя ў нашай краіне, захоўваць і шырыць народныя традыцыі і матчыну мову.

ПАДПІСНЫ КОШТ

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

| Індэкс | месяц | квартал | паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 11660 | 34980 | 69960 |
| 63145 (інд.для ветэранаў ВАВ, пенсіянераў) | 10990 | 32970 | 65940 |
| 63858 (ведамасны) | 18750 | 56250 | 112500 |
| 63239 (ведамасны, для устаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 17100 | 51300 | 102600 |

Падпіска праз кіёскі і крамы РУП «Белпошта» («Да запатрабавання»)

| | | | |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 10530 | 31590 | 63180 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ, пенсіянераў) | 9860 | 29580 | 59160 |
| 63858 (ведамасны) | 16660 | 49980 | 99960 |
| 63239 (ведамасны, для устаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 15290 | 45870 | 91740 |

Падпіска праз кіёскі і крамы РУП «Белсаюздрук» («Да запатрабавання»)

| | | | |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 10040 | 30120 | 60240 |
| 63145 (інд.для ветэранаў ВАВ, пенсіянераў) | 9410 | 28230 | 56460 |
| 63858 (ведамасны) | 13494 | 40482 | 80964 |
| 63239 (ведамасны, для устаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 12779 | 38337 | 76674 |

Заставайцеся з намі!


## КОШЫКАВАЯ ГАРМОНІЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхары вёскі Граўжышкі Ашмянскага раёна гарманісты і работнікі культуры Вацлаў СІДАРОВІЧ (злева), Эдуард БУЛКЕВІЧ і майстар-кашаплёт Рамуальд ГАЙБОВІЧ частыя ўдзельнікі вясковых і рэгіянальных святаў.

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### РЭКОРДНЫ ДЛЯ БЕЛАРУСІ ГРАШОВЫ ПРЫЗ У 766 МЛН 955 ТЫС. 510 БЕЛАРУСКІХ РУБЛЁЎ ЗНАЙШОЎ СВАЙГО ЎЛАДАЛЬНІКА

Пра гэта паведамілі ў ЗАТ «Спорт-пары». Такую астранамічную суму (Джэк-пот і Br300 млн) атрымаў пераможца электроннай інтэрактыўнай гульні «Спартлато 5 з 36» 24-гадовы студэнт 5 курса Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта Міхаіл. Да гэтага самы буйны выйгрыш у латарэі і інтэрактыўныя гульні не перавышаў Br500 млн.

Прычынай затрымкі ў атрыманні выйгрышу стала смерць блізкага сваяка пераможцы. Паводле слоў наваяўленага мільянера Міхаіла, ён ужо пусціў у справу выйграныя грошы — перавёў некаторую суму ў два дзіцячыя дамы, набыў кватэру ў Мінску і новы аўтамабіль. На памяць аб сваім дзядулі, які быў вінаробам, малады чалавек набыў вінаграднікі ва Украіне.

**Кар. БЕЛТА.**

### ХВОРЫХ ЭВАКУЯВАЛІ З ВЯСКОВАЙ БАЛЬНІЦЫ

**З Запольскай участковай бальніцы Віцебскага раёна з-за паведамлення пра тое, што будынак заміраваны, эвакуявалі хворых — усяго 19 чалавек, большасць з якіх ляжачыя.**

Пра магчымасць выбуху паведаміў у пажарную службу выканаўца абавязкаў галоўнага ўрача бальніцы, якому пра замініраванне паведаміў невядомы. Да месца здарэння аператыўна былі накіраваны пажарныя падраздзяленні — ажно чатыры брыгады «хуткай неадкладнай дапамогі», сапёры. 19 хворых эвакуявалі з выкарыстаннем санітарнага аўтамабіля ў мясцовую сярэднюю школу. Міны не было.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### БУДАЎНІК ЗВАЛІЎСЯ З 19-ПАВЯРХОВАГА ДОМА

**У Мінску ў мінулую пятніцу днём на будоўлі адбылося трагічнае здарэнне: загінуў брыгадзір, які знаходзіўся на даху ўзводзімага дома.**

Як паведаміў старшы памочнік пракурора Мінска Сяргей Балашаў, здарылася бяда каля дзвюх гадзін дня на вуліцы Казырэўская, 70. 42-гадовы работнік аднаго з будаўнічых упраўленняў сталіцы стаяў на даху 19-павярховага дома, што будуецца, зваліўся ўніз і загінуў. Паводле слоў суразмоўцы, у крыві загінулага няма слядоў алкаголю. Праверку па гэтым факце вядзе пракуратура Ленінскага раёна.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «УДЗЕЛ БЕЛАРУСІ Ў АГУЛЬНАЕЎРАПЕЙСКІХ ПРАЦЭСАХ НЕ ПАВІНЕН ПЕРАКРЭСЛІЦЬ ВЫГАДЫ АД ІНТЭГРАЦЫІ З КРАІНАМІ СНД»

«Адносіны з Еўрапейскім саюзам як магутным кансалідаваным партнёрам з'яўляюцца адным з асноватворных фактараў для забеспячэння незалежнасці і суверэнітэту, а таксама эканамічнага і навукова-тэхналагічнага развіцця Беларусі. Аднак гэта не азначае, што ў імкненні атрымаць перавагу, якая выйкае з больш шчыльнай інтэграцыі з ЕС, Беларусь будзе ахвяраваць сацыяльна-палітычнай стабільнасцю ў грамадстве і дасягнутым узроўнем супрацоўніцтва з Расіяй і іншымі дзяржавамі», — заявіў 2 лістапада Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытаннях развіцця адносінаў з ЕС.

Аляксандр Лукашэнка лічыць недапушчальным, каб удзел Беларусі ў агульнаеўрапейскіх працэсах перакрэсліў усе выгады ад інтэграцыі з Расіяй і іншымі дзяржавамі СНД.

«Беларусь не збіраецца сябраваць з Еўрасаюзам супраць інтарэсаў іншых дзяржаў і наадварот», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Сёння як ніколі неабходны ўзважаны і паслядоўны падыход да рэалізацыі знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай ліній. «Падарункаў і прэферэнцый нам чакаць не варта ні ад Расіі, ні тым больш ад Захаду», — сказаў ён.

«Трэба дакладна ўсведамляць, што Беларусь у сістэме еўрапейскіх адносінаў не з'яўляецца прасітелем з працягнутай рукой», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Беларусь — надзейны і правераны часам партнёр ЕС у галіне забеспячэння рэгіянальнай стабільнасці і бяспекі, у сферы транзіту энерганосьбітаў і трансеўрапейскіх грузаў, уносіць значны ўклад у барацьбу з усімі відамі транстранічнай злачыннасці, нелегальнай міграцыяй, паслядоўна і актыўна ўдзельнічае ў міжнароднай антытэрарыстычнай кааліцыі. Тым не толькі ЕС карысны для Беларусі, але і наша краіна не менш карысная для Еўропы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў пэўнае пацяпленне ў беларуска-еўрапейскім дыялогу: актывізаваліся кантакты з еўрапейскім бізнесам, развіваецца крэдытна-інвестыцыйнае супрацоўніцтва з міжнароднымі фінансавымі інстытутамі. «Мы сталі паўнапраўнымі ўдзельнікамі «Усходняга партнёрства», ужо сур'ёзны эфект ад гэтага, такі, які можа «памацаць рукамі», пакуль невідавочны», — сказаў Прэзідэнт.

У той жа час кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь будзе кіравацца выключна нацыянальнымі інтарэсамі, а не чымі б там ні было геапалітычнымі амбіцыямі, «нават калі яны зыходзяць ад нашых бліжэйшых саюзнікаў».

«Кожны крок насустрач Беларусі контрагенты абумоўліваюць патрабаваннямі ўступак з нашага боку, у эканамічнай гэта або ў палітычнай галіне», — канстатаваў ён. Беларускі лідар са шкадаваннем заўважыў, што ў асобных еўрапейскіх сталіцах да гэтай пары ёсць схільнасць «рухацца па інерцыі» ў адносінах з Беларуссю, выкарыстоўваючы інструменты палітычнага і эканамічнага ціску. Да гэтага часу захоўваецца шэраг абмежаванняў, прычым даволі адчувальных для нашай краіны. Гэта абсалютна непрымальна ў пабудове цывілізаванага дыялогу на аснове прынцыпаў раўнапраўя і ўзаемапавагі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## У БЕЛАРУСІ НЯМА ЭПІДЭМІІ ГРЫПУ A/H1N1

**У Беларусі няма эпідэміі грыпу A/H1N1, заявіла 1 лістапада журналістам намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Валянціна КАЧАН.**

«Няма прычын для панікі ў сувязі са свіным грыпам, у нашай краіне эпідэміі гэтага захворвання няма», — падкрэсліла Валянціна Качан.

У той жа час яна паведаміла, што колькасць выпадкаў захворвання на грып A/H1N1 у Беларусі павялічылася. Калі ў мінулую пятніцу было лабараторна пацверджана 39 такіх выпадкаў, то на 1 лістапада гэта колькасць складае 59. «Размова ідзе аб такіх выпадках, у якіх гэты вірус суправаджаецца іншай інфекцыяй, — адзначыла намеснік міністра. — Лятальных выпадкаў ад пандэмічнага свінога грыпу ў Беларусі не зарэгістравана».

Валянціна Качан асабліва падкрэсліла, што ўсе меры па прадухіленні распаўсюджвання ў Беларусі грыпу A/H1N1 распрацоўваліся яшчэ пачынаючы з красавіка, калі ўпершыню з'явілася інфармацыя аб новым вірусе ў рэспубліцы. «Тыя меры, якія былі напрацаваны, спрацоўваюць, — сказала яна. — Няма неабходнасці панікаваць, пакуль што размова не ідзе аб якіх-небудзь жорсткіх мерах па прадухіленні распаўсюджвання свінога грыпу, у тым ліку масачным рэжыме і г.д.» Аптэкі і лячэбна-прафілактычныя ўстановы забяспечаны прафілактычнымі і медыкаментознымі сродкамі. «Прыемна, што адным з больш эфектыўных сродкаў барацьбы з віруснымі захворваннямі стаў айчынны сродак «Арпетол», — адзначыла Валянціна Качан. — Мы рэкамендуем яго як для прафілактыкі, так і для лячэння ўскладненняў».

У Беларусі «ідзе змешаная інфекцыя». Спецыялісты Міністэрства аховы здароўя адсочваюць усе тыя вірусы, якія цыркулююць у Беларусі. «На грып A прыпадае каля 10 працэнтаў — у асноўным адэнавірусныя і паравірусныя інфекцыі», — удакладніла Валянціна Качан.

Намеснік міністра выказала ўпэўненасць у тым, што развіццю эпідэміялагічнага працэсу ў Беларусі ва ўмераным рэжыме будуць садзейнічаць і вынікі вакцынацыі, якая цяпер завяршаецца. «Яна дасць свой эфект, мы перакананы, што гэта дапаможа прадухіліць якія-небудзь сур'ёзныя ўскладненні, а таксама будзе садзейнічаць развіццю эпідэміялагічнай сітуацыі ва ўмераным рэжыме», — сказала Валянціна Качан.

**БЕЛТА.**

СТАР. 2

Надзённае

## КАНІКУЛЫ ЯК ПРАФІЛАКТЫЧНАЯ МЕРА

**У Магілёве і Бабруйску прадоўжаны школьныя канікулы: усе школы гэтых гарадоў не будуць працаваць яшчэ тыдзень.**

Санітарныя ўрачы тлумачаць, што адбываецца пад'ём захваральнасці на вострыя рэспіраторныя і вірусныя інфекцыі. Сезонныя хваробы сёлета апанавалі грамадства раней.

— У Магілёве і Бабруйску ў мінулыя чацвер і пятніцу эпідэмічны парог быў перавышаны ў 3 разы, — патлумачыў **загадчык аддзела эпідэміялогіі Магілёўскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Аляксандр ПАНЯТОЎ**. — На астатняй тэрыторыі Магілёўскай вобласці, акрамя двух самых буйных гарадоў, эпідсітуацыя застаецца звычайнай.

Эпідэмія можа быць аб'яўлена, калі на працягу трох дзён эпідпарог будзе перавышаны ў 3 разы. Сітуацыя ў Магілёўскай вобласці, лічыць Аляксандр Панятоў, стане зразумелай у сярэдзіне тыдня. Працяг школьных канікулаў — гэта дзейсная прафілактычная мера: кантакт перарываецца, і распаўсюджванне інфекцыі запавольваецца.

— Што датычыцца так званага «свінога грыпу», то ў рэгіёне за апошні час зарэгістраваны 4 выпадкі, — зазначыў санітарны ўрач. — Аднак хвароба ва ўсіх гэтых людзей працякала ў лёгкай форме, без ускладненняў, і яны паспяхова ачунялі і вярнуліся да звычайнага жыцця.

**Ілона ІВАНОВА.**

Як нас дураць

## ЯК СЛЕСАР ТАННЫЯ КВАТЭРЫ ПРАПАНОЎВАЎ

### І спасылаўся пры гэтым на крызіс

Новыя кватэры — па цане, ніжэйшай за рыначную і на ўмовах ільготнага крэдыту. Мара! Ажыццяўляў мары слесар адной з віцебскіх фірмаў. Міхаіл прапаноўваў такім чынам папраўіць жыллёвае пытанне сваім знаёмым. Гаварыў пра двухпакаёвыя кватэры коштам прыкладна за 30—32 мільёны рублёў. Пры гэтым заплаціць адразу трэба толькі 3,8 тысячы долараў. А астатнюю суму, маўляў, аплачвае будаўнічая арганізацыя, якая дае растэрміноўку на 20 гадоў...

Каб яшчэ большы давер выклікаць да і без таго цікавай прапановы, «сакрэтнічаў»: я ж і сам купіў кватэру па такой жа схеме. І не кожны можа «трапіць» у схему. Толькі «свае людзі». Ёсць адзін добры знаёмы — намеснік дырэктара будаўнічай арганізацыі, які і вырашае пытанне пра тое, каму будзе дадзена права купіць танную кватэру на прывабных умовах. І, зразумела, трэба неяк «падзякаваць» добраму чалавеку.

Слесар прасіў 700 долараў для дачы хабару адказнай асобе. І яшчэ 3,8 тысячы долараў для, быццам бы, размяшчэння на банкаўскі дэпазіт.

Як расказаў «Звяздзе» **следчы пракуратуры Першамайскага раёна горада Віцебска Васіль ПАРУСАЎ**, такім чынам слесар падмануў трох грамадзян. Яны, так і не дачакаўшыся такіх жаданых квадратных метраў уласнага жылля, звярнуліся па дапамогу ў праваахоўныя органы. А цярпелі і чакалі абяцанага доўгі час.

На іх пытанні наконт таго, калі ж будуць падпісваць дагавор пра набыццё жылля, іх знаёмы слесар усё супакойваў: не хвалюйцеся, хутка, пачакайце, я трохі заняты. У ліку іншага спасылаўся на крызіс — маўляў, час цяпер такі, усё не так хутка вырашаецца, як хацелася б.

У выніку ахвяры яго падману не вытрымалі і потым фактычна добраахвотна прызналіся ў тым, што перадалі хабар.

Дарэчы, напэўна ўсе ведаюць, што судовае пакаранне ў такіх выпадках за хабар не прадугледжаны. Але... Прозвішчы тых, хто прызнаўся, усё адно будуць занесены ў адзіны дзяржаўны банк звестак, як аб асобах, якія ўчынілі супрацьпраўнае дзеянне. Як кажуць, «пляма»...

А слесар-пасрэднік прыгаворам суда Першамайскага раёна Віцебска пазбаўлены волі тэрмінам на пяць гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Па чутках і аўтарытэтна

## БАНКІР «АБАНКРУЦІЎ» ЯПОНІЮ І ЗША

**Экстравагантная заява кіруючага дырэктара швейцарскага банка — рэальная пагроза, ці толькі жаданне звярнуць на сябе ўвагу?..**

**У мінулым месяцы свет «адзначыў» гадавіну пачатку «Вялікай рэцэсіі», калі пасля гучнага банкруцтва фінансавага гіганта Lehman Brothers абваліўся амерыканскі рынак, што выклікала масавыя абвалы фондавых рынкаў і надыход найбуйнейшага крызісу. Згадваючы тыя падзеі, многія эканамісты, якія ацэньваюць ужо цяперашнюю сітуацыю, кажуць пра спыненне катастрафічнага падзення сусветнай эканомікі і бачаць прыкметы яе ажыўлення. Аднак ёсць і супрацьлеглыя меркаванні, у якіх аналітыкі больш схільныя да песімістычных ацэнак найбліжэйшай будучыні. А асобныя эксперты нават на прыкладзе банкруцтва таго ж Lehman Brothers, якое летам 2008 года падавалася малаверагодным, кажуць пра новыя рызыкі, здольныя зняцку заспець свет і істотна паўплываць на яго далейшае развіццё.**

Так, неверагодны, прынамсі на цяперашні час, сцэнарый агучаны кіруючым дырэктарам аднаго з буйнейшых швейцарскіх банкаў UBP Крыстафам Бернардам, які заявіў пра тое, што ў найбліжэйшыя дватры гады могуць абанкруціцца буйнейшыя краіны свету. У прыватнасці, ён выказаў апасенні, што знешні доўг вядучых развітых краін можа вырасці да 20—30 працэнтаў да памеру бюджэту гэтых краін, і гэта прывядзе да няздольнасці ўрадаў абслугоўваць свае даўгі. Паводле слоў Крыстафа Бернарда, у выніку вядучыя краіны ЕС, Японія, а ўслед за імі і ЗША не змогуць рэструктуяваць даўгавы цяжар на ўласныя бюджэты і страцяць давер пазычальнікаў і інвестараў. Карацей, калі ацэнкі швейцарскага банкіра маюць пад сабой глебу, нас чакаюць яшчэ тыя «сюрпрызы», гэта значыць крызіс працягнецца.

**Эксперту «Звязды», дэкану эканамічнага факультэта БДУ, прафесару Міхаілу КАВАЛЁВУ** такі сцэнарый падаецца малаверагодным.

— Што датычыцца ЗША, то, безумоўна, калі б уся кітайская дыяспара свету аб'ядналася і захацела запатрабаваць даўгі амерыканцаў, то Злучаныя Штаты вымушаны былі б абвясціць дэфолт, ці істотную дэвальвацыю, — кажа наш эксперт. — Але, як вы разумееце, гэтага не будзе, таму што ў такім выпадку кітайцы шмат што страчваюць. Калі ж весці гутарку пра знешні і ўнутраны доўг краін Еўрасаюза, то ў іх гэты доўг істотна адрозніваецца. Найбольшы доўг, наколькі я памятаю ў Бельгіі, у краін накшталт Германіі ён меншы. І што важна, ніхто датэрмінова прад'яўляць да пагашэння даўгі краінам ЕС не будзе. Сапраўды, даўгі вялікія, аднак яны расцягнутыя ў часе. І магутнасць развітых краін трымаецца не толькі на іх тэхналагічнай перавазе, але і ў псіхалагічнай веры народаў свету ў долар, еўра.

СТАР. 2

## Некаторыя сацыяльныя выплаты ўзрастуць. А «планка» крэдытаў — знізіцца

**У лістападзе—студзені ў Беларусі будуць дзейнічаць новыя бюджэты пражытковага мінімуму. У прыватнасці, цяпер БПМ у цэнах верасня ў сярэднім на душу насельніцтва складае 250 070 рублёў, што перавышае папярэдні паказчык гэтага сацыяльнага нарматыву на 0,3 працэнта.**

Адпаведна, зыходзячы з новага БПМ, з 1 лістапада ў краіне будуць праіндэксаваныя памеры мінімальных і сацыяльных пенсій, а таксама надбавак і павышэнняў. Апроч таго, на 0,3 працэнта павялічацца памеры дзіцячых дапамог. Напрыклад, цяпер аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці складае 1 млн 250 350 руб., другога і наступных дзяцей — 1 млн 750 490 руб., а штомесячная дапамога на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — 200 060 рублёў.

Адначасова з 1 лістапада крыху павысіцца і «планка даходаў» для прызначэння штомесячнай адраснай сацыяльнай дапамогі — да 250.070 рублёў. Гранічная ж «планка даходаў» пры прызначэнні аднаразовай адраснай падтрымкі да 31 снежня вызначана ў памеры 300 080, а з 1 па 31 студзеня — 375 100 рублёў.

Пры гэтым зацверджаныя і новыя памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў. Прычым у сувязі з сезонным патаненнем садавіны і агародніны сярэдні МСБ знізіўся на 0,1 працэнта і складае цяпер 387 690 рублёў. Менавіта такі паказчык у найбліжэйшы час будзе брацца ў разлік пры вызначэнні права на атрыманне льготных крэдытаў на будаўніцтва і набыццё жылля.

**Сяргей ГРЫБ.**

Эканоміка

## ЗНЕШНІ ГАНДАЛЬ ТАВАРАМІ — МІНУС БОЛЬШ ЯК $5 МЛРД

**У студзені—верасні гэтага года, паводле апошніх звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, сальда знешняга гандлю таварамі склалася адмоўным у памеры 5021,3 мільёна долараў ЗША.**

Аб'ём знешняга гандлю таварамі за гэты перыяд склаў 35039,5 мільёна долараў і ў параўнанні са студзенем—вераснем мінулага года скараціўся на 38,7 працэнта. Экспарт тавараў знізіўся ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам на 43,3 працэнта і склаў 15009,1 мільёна долараў, імпарт скараціўся на 34,8 працэнта і склаў 20030,4 мільёна.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Надвор'е

## ПАЧАТАК ТЫДНЯ Ў БЕЛАРУСІ АБЯЦАЕ БЫЦЬ ХАЛОДНЫМ

Ноччу сіноптыкі прагназуюць ад мінус 2 да мінус 9 градусаў. Тэмпература паветра ў дзённыя гадзіны будзе вагацца ад 2 градусаў марозу да 3 градусаў цяпла. На большай частцы тэрыторыі Беларусі ў гэтыя дні ападкаў не чакаецца. Толькі 4 лістапада ў паўднёва-заходніх раёнах Брэсцкай вобласці магчымы невялікі снег.

У чацвер, 5 лістапада, у заходніх рэгіёнах Беларусі чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу, а 6 лістапада сіноптыкі прагназуюць мокры снег на большай частцы тэрыторыі краіны. У заходніх раёнах у гэты дзень магчымы дождж. Ноччу слупок тэрмометра ва ўсходніх раёнах будзе паказваць 6 градусаў марозу, у той час як на захадзе Беларусі пацяплее да 2 градусаў. Тэмпература паветра ў дзённыя гадзіны будзе вагацца ад 1 градуса марозу да 5 градусаў цяпла.

Бліжэй да выхадных тэмпературны фон пачне павышацца. У асобных раёнах чакаецца туман і слабы галалёд. Тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. Днём слупок тэрмометра пакажа ад 0 да 6 градусаў цяпла. На паўднёвым усходзе краіны ў гэтыя дні пацяплее да 7-8 градусаў.

**БЕЛТА.**

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.11.2009 г. (для б/н разлікаў)

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 737,00 |
| ▼ 1 еўра | 4 042,28 |
| 1 латвійскі лат | 5 706,24 |
| 1 літоўскі літ | 1 171,54 |
| 1 чэшская крона | 152,94 |
| 1 польскі злоты | 950,86 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 93,75 |
| 1 украінская грыўня | 337,69 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 29,1944 |
| UAH | 36,0202 |
| 1000 BYR | 10,6900 |
| EUR | 43,0588 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X

Увага!
Адкрыта падпіска
на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі
на I паўгоддзе 2010 года
Нашы паслугі па падпісцы:
www.belpost.by
падпіска на абанементную скрыню
падпіска на даму
дастаўка да кватэры з уручэннем «з рук у рукі»
падпіска праз Інтэрнэт
магчымасць аплаты пры дапамозе пластыкавых картак
прыём падпіскі па факсу для юрыдычных асоб
Падрабязную інфармацыю вы можаце атрымаць у любым аддзяленні паштовай сувязі ці па тэлефонах у г. Мінску:
222-72-17, 293-55-95, 227-20-31
Брэсцкі філіял (8-0162) 200-804
Віцебскі філіял (8-0212) 476-139
Гомельскі філіял (8-0232) 715-342
Гродзенскі філіял (8-0152) 757-159
Мінскі філіял (8-017) 222-75-65
Магілёўскі філіял (8-0222) 310-882
БЕЛПОШТА

АУКЦИОН

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «НЕСВИЖСКИЙ РАЙАГРОСЕРВИС» КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже складского комплекса, расположенного по адресу: **Минская область, Несвижский район, г.п. Городея, ул. Вокзальная, 23А,** в составе: зданий складов №№ 1, 2, 3, 4, 5 (об. пл. 847,8 кв.м; 1230,5 кв.м; 848,5 кв.м; 847,7 кв.м, 1158,2 кв.м), здания проходной, об. пл. 14,6 кв.м; административного здания, об. пл. 361,5 кв.м; бытового помещения, об. пл. 135,5 кв.м; сборочного цеха, об. пл. 1099,1 кв.м. Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 1 609 803 200 бел. руб. Под обслуживание объектов недвижимости сформированы земельные участки об. пл. 1,2299 га; 0,4298 га; 1,0950 га; 0,3800 га; 0,2267 га; 1,8757 га. Задаток 50 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 26.09.2009. Аукцион состоится **10.11.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.11.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «АВТОМАГИСТРАЛЬ» (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания бытового помещения, об.пл. 188,0 кв.м, расположенного по адресу: Могилевская область, Чаусский район, д. Атражье. Начальная цена с НДС – 10 070 680 бел. руб. Площадь земельного участка 0,6600 га. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **04.12.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.12.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА

отказывается от проведения открытого конкурса по продаже объектов коммунальной собственности г. Минска и на право заключения договора аренды земельного участка для их обслуживания, объявленного на 4 декабря 2009 года. Извещение о проведении конкурса, опубликованное в газете «Звязда» 21 октября 2009 года № 199 (26557) СЧИТАТЬ УТРАТИВШИМ СИЛУ.

УНП 100048181

Погляд

# Той дзень, калі ўпала сцяна...

## Да 20-й гадавіны ліквідацыі памежных збудаванняў паміж Заходнім і Усходнім Берлінам. Успаміны і роздум

9 лістапада 2009 года ў Германіі ды і ва ўсёй Еўропе будуць адзначаць 20-годдзе ліквідацыі берлінскай сцяны — штучнага і пачварнага збудавання часоў «халоднай вайны», якое ў 1961-1989 г.г. дзяліла Берлін на дзве часткі: пасярэдзіне горада праходзіла мяжа з бетоннымі сценамі і калючым дротам. Агульная яе даўжыня непасрэдна па жылых кварталах горада складала каля 40 км, а па ўсім перыметры Заходняга Берліна — каля 150 км, вышыня памежных збудаванняў была ад 3,40 да 4,20 м (!).



Гэта была сапраўдная мяжа, дзе стралялі і не пускалі. Берлінская сцяна ўзнікла ў выніку ідэалагічнага, ваеннага і эканамічнага супрацьстаяння ў Еўропе і ў выніку няздольнасці тагачасных кіраўнікоў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі дамовіцца наконт аб'яднання Германіі. Сцяна і памежны кантроль былі ўсталяваны 13 жніўня 1961 г. уладамі ГДР са згоды і пры маральнай падтрымцы СССР, каб спыніць пераход усходніх немцаў на Захад (праз адкрытыя да 1961 г. межы Берліна з ГДР выехала каля 3 млн чалавек!). Сцяна стала сімвалам несвабоды, расколу не толькі Берліна, але і Германіі, а таксама Еўропы ў цэлым. Яна падрывала чалавечую годнасць берлінцаў, бо прайшла па сем'ях, душах і лёсах.

Я не хацеў бы паглыбляцца ў гісторыю ўзнікнення і існавання сцяны ў Берліне. Аб гэтым ужо шмат напісана. Я спынюся на сваіх успамінах і разважаннях, бо для мяне 80-я гады ў Берліне спляліся ў неразрыўны клубок гісторыі, палітыкі, беларушчыны і асабістых перажыванняў. У Берліне закладваліся падмуркі як маёй прафесійнай дзейнасці, так і сямейнага жыцця: тут мы з жонкай упершыню змаглі жыць у асобнай кватэры (няхай сабе і ў службовай), тут я ўпершыню ўбачыў сваіх двух сыноў.

Так здарылася, што мае першыя працоўныя крокі былі зроблены ў Заходнім Берліне, куды я ў 1984 г. быў накіраваны на працу ў генеральнае консульства СССР пасля вучобы ў інстытуце міжнародных адносінаў у Маскве. Я атрымаў добрую адукацыю і спецыялізацыю па нямецкамоўных краінах. Вядома ж, як і ўсе, марыў паехаць туды працаваць — у ФРГ, ГДР, Аўстрыю ці Швейцарыю. А вось Заходні Берлін у гэты мой спіс ніяк не ўваходзіў, бо лічыўся не краінай, а «асобным палітычным утварэннем». Як толькі я даведаўся пра камандзіроўку, пачаў у галаве перабіраць адпаведныя звесткі і інфармацыю. Перш-наперш узгадаў ідэалагічны штамп пра Заходні Берлін — «гняздо палітычных дыверсій» супраць сацыялістычных краін, горад з акупацыйным рэжымам, дзе камандуюць амерыканцы. Я трохі сумеўся, але выбару не было, трэба было ехаць.

Першы дзень працы ў генконсульстве выпаў на 13 жніўня — гадавіну ўзвядзення берлінскай сцяны — і прайшоў у атмасферы дэманстрацый супраць палітыкі ГДР у галіне свабоды перамяшчэння людзей. На кантрасце з гэтай палітыкай ГДР (за якой, вядома ж, стаяў СССР) акупацыйныя ўлады ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі змаглі стварыць даволі прывабныя ўмовы для насельніцтва Заходняга Берліна.

Жыццё за берлінскаю сцяною мела свае асаблівасці. Нягледзячы на фізічна і псіхалагічна звужаную гарадскую прастору, існавала нейкае дзіўнае пачуццё свабоды. Я як дыпламат мог даволі свабодна перамяшчацца праз мяжу, а на цэнтральным берлінскім КПП «Чэкпойнт Чарлі» службовы аўтамабіль нават не спынялі. Кіраўніцтва генконсульства раіла супрацоўнікам выязджаць з сем'ямі ў ГДР, асабліва на савецкія святы, каб «пазбегнуць правакацыяў у варожым асяроддзі» Заходняга Берліна. А вось да сябе ў госці мы амаль нікога запрасіць не маглі. Нам не дазвалялі запрашаць бацькоў, сяброў і нават сем'і ў поўным складзе калегаў з Пасольства СССР у ГДР, што знаходзілася ва ўсходняй частцы Берліна (адзін з членаў сям'і павінен быў застацца як закладнік). У гэтай сувязі ўспамінаю берлінскія жарты аб тым, што яшчэ невядома, хто ад каго адгарадзіўся сцяною і хто каго баяўся. З боку Заходняга Берліна да сцяны можна было падысці, нават размалёўваць яе, а з боку ГДР была памежная зона з сабакамі і патрульнымі вышкамі.

Так здарылася, што Заходні Берлін дапамог мне ў паглыбленні ведаў пра беларушчыну. Цікавай і новай крыніцай інфармацыі пра Беларусь стала для мяне бібліятэка Свабоднага ўніверсітэта. Я знайшоў там цэлы беларускі аддзел, дзе было шмат эміграцкай літаратуры. У тыя савецкія часы гэта было для мяне незвычайнай падзеяй! Там я ўпершыню прачытаў В. Ластоўскага, Л. Геніюш, Я. Станкевіча і іншых, а таксама Біблію на беларускай мове.

Каб не адарвацца ад жыцця на малой радзіме — у Беларусі, я выпісваў таксама штотыднёвік «Літаратура і мастацтва». Атрымліваў яго, праўда, з вялікім спазненнем, бо дасылаўся ён праз палявую пошту савецкіх войскаў у Германіі, а потым трапляў да мяне ў Заходні Берлін праз пасольства СССР у ГДР. Часта яго нехта забіраў, гэта мяне спачатку вельмі злавала, але потым я нават узрадаваўся: у Германіі было нямала калегаў-беларусаў, якія з задавальненнем чыталі па-беларуску. Большасць з іх, праўда, лічыла, што «Літаратура і мастацтва» прыходзіць у пасольства не па прыватнай падпісцы, а як прапагандысцкі матэрыял.

Летам 1988 года ў Заходнім Берліне я пазнаёміўся з Васілём Быкавым, які прыехаў у камандзіроўку. Памятаю, павітаўся з ім па-беларуску, сказаў, хто я і адкуль, а ён на хвілінку задумаўся і перш-наперш сказаў: «У Вас, пэўна, вельмі старажытнае беларускае прозвішча...». Потым я суправаджаў пісьменніка на сустрэчах з немцамі, дыскутаваў з ім наконт падзей у Беларусі, лёсу беларускай мовы і г.д. Васіль Уладзіміравіч падараваў мне дзве свае кнігі — аповесць «Знак бяды» і раман «Кар'ер» з аўтографамі ў знак сардэчнай дружбы і з пажаданнем шчасця ў сталіцы... Дзяржаўная сталіца тады была далёка, у Маскве... А сёння ж гэта сталіца ўжо ў поўным сэнсе знаходзіцца ў Мінску, на роднай зямлі. Пажаданні В.Быкава наконт майго шчасця ў сталіцы, такім чынам, атрымліваюць зусім іншы змест. Хто ведае, можа некалі так і здарыцца!

У Берліне адбыўся яшчэ адзін цікавы выпадак, звязаны з Беларуссю. Гуляючы неяк са сваім малым сынам Алесем у парку, натрапіў на бабулек-немак. Выказаўшы шмат кампліментаў хлопчыку, яны спыталіся, адкуль мы. Паколькі «Belarus» ім была невядомая, я мусіў выкарыстаць тэрмін «Weissrussland» (Белая Русь). Жанчыны яшчэ больш узрушыліся, заўважыўшы, што заўсёды сімпатызавалі «белым рускім» і не любілі «чырвоных», а потым нават падзякавалі Богу, што мы на свабодзе ў вольным свеце! Спачатку я не зразумеў, што яны маюць на ўвазе, а потым дакумекаў, што яны, аказваецца, пераблыталі белагвардзейцаў з беларусамі! Вось такі кур'ёз гісторыі з геаграфіяй...

У канцы 80-х гадоў сітуацыя ў Берліне і ГДР была напружаная. Адчувалася, што хутка ў Германіі адбудуцца нейкія грунтоўныя падзеі. Палітычны рэжым у ГДР і берлінская сцяна былі яшчэ даволі моцнымі, але ўжо пачыналі хістацца. Гэта было бачна паўсюдна. Моладзь у сталіцы ГДР адкрыта вітала нават аўтамабілі з Заходняга Берліна. Бывала, і мне ля мяжы, не разабраўшы нумарныя знакі, махалі і крычалі: «Сцяну — далоў!». Мы тады яшчэ не ўяўлялі сабе, як хутка адбудзецца аб'яднанне Германіі і ў цэнтры Берліна, нарэшце, можна будзе вольна шпацыраваць.

Адным з яркіх маіх уражанняў таго часу стаў канцэрт вядомага гурту «Пінк Флойд» перад будынкам рэйхстага, непасрэдна каля сцяны, у 1988 годзе. Гукаўзмацняльная апаратура была пастаўлена так, каб было чуваць і ў Берліне ГДР. І там тысячы людзей, якіх ледзьве стрымлівалі памежнікі ГДР, таксама слухалі канцэрт — за сцяною, не бачачы выканаўцаў! Канцэрт пад сімвалічнаю назваю «Сцяна» (меламаны ведаюць, што менавіта так называўся легендарны альбом гурта) быў разлічаны і на іх. Музыка і спевы разліваліся ў паветры, і іх нельга было спыніць бетоннымі памежнымі плітамі. Пасля гэтага канцэрта я зразумеў, што сцяна доўга не пражыве... Бо так захацелі людзі з абодвух яе бакоў, і ў іх вачах не было страху!

Сёння сцяна знікла як фізічны бар'ер, але ў галовах і штодзённым жыцці немцам нават да гэтага часу не ўдалося цалкам забыцца пра яе, хаця прайшло ўжо столькі гадоў і вырасла новае пакаленне берлінцаў. Тым не менш ніхто з немцаў не хацеў бы вяртання старых часоў, бо ўсе ўжо глытнулі свабоды.

Жыццё пакарае таго, хто спазняецца, як некалі сказаў М. Гарбачоў, звяртаючыся да кіраўніцтва ГДР. Рэжым ГДР спазніўся (а можа, і не захацеў) пачуць і зразумець новыя тэндэнцыі ў Еўропе, настрой і інтарэсы свайго народа, таму знік літаральна за адзін дзень, хаця здаваўся такім непахісным за бетонным берлінскім мурам.

У той дзень, 9 лістапада 1989 г., калі пад націскам людзей упала сцяна ў Берліне, я добра памятаю, што мы з жонкай купілі шампанскае і выпілі за разбурэнне муроў і межаў, якія раздзяляюць людзей. Вельмі спадзяюся, што некалі вып'ем за гэта, едучы ў Варшаву або Вільню, і на рэштках заходніх межаў Беларусі, якія мне нагадваюць былую берлінскую сцяну. У гэтым рэгіёне стагоддзямі не было ніякіх граніцаў, тут стагоддзямі людзі, ідэі, культура і эканоміка свабодна перамяшчаліся. А сёння, у XXI стагоддзі, насуперак логіцы еўрапейскага цывілізацыйнага развіцця, тут раптам набудавалі глухіх межаў. Рэжым на заходніх межах Беларусі — гэта недарэчны рэлікт і вынік няздольнасці дамовіцца і вырашыць пытанне ў інтарэсах свабоды людзей. Еўрапейскаму саюзу павінна быць сорамна за шэнгенскі мур, які аддзяляе Беларусь ад заходняй часткі калыскі нашай цывілізацыі, і за тое, што з беларусаў бяруць грошы за візы па павышаным тарыфе!

**Віктар ЧАЙЧЫЦ,**
**сябра Вялікай Рады Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына»,**
*Масква.*

## РАЗБІЎСЯ ВЕРТАЛЁТ ПОЛЬСКАЙ АХОВЫ

**У Камянецкім раёне непадалёк ад г/п Высокае прыкладна ў 200 м ад дзяржаўнай мяжы з Польшчай пацярпеў аварыю верталёт польскай аховы. Тры члены экіпажа загінулі.**



Верталёт, які рабіў аблёт польска-беларускай мяжы, не выйшаў на сувязь з дыспетчарам у суботу вечарам, а знайшлі абломкі яго толькі ў 4 гадзіны 48 хвілін 1 лістапада. У цемры і пры густым тумане выйсці на месца трагедыі было няпроста.

Ужо раніцой у нядзелю генеральны консул Польшчы ў Брэсце Я. Ксёнжык, міністр унутраных спраў Польшчы, галоўны памежны камендант разам з іншымі прадстаўнікамі суседняй краіны наведалі месца авіякатастрофы.

Там пабываў і намеснік брэсцкага транспартнага пракурора Віктар Строк. Беларуская транспартная пракуратура праводзіць праверку.

Прычына падзення машыны невядомая, але не выключаюцца і тэхнічныя непаладкі.

Астанкі загінулых пілотаў дастаўлены ў Брэст для медэкспертызы і індэнтыфікацыі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Здарэнні

### З ЧЫГУНАЧНАЙ ЦЫСТЭРНЫ ВЫЦЯКАЎ БЕНЗІН

**На чыгуначнай станцыі Орша-Цэнтральная абходчык пры аглядзе стану чыгуначнага саставу ўбачыў, што з 60-тоннай цыстэрны выцякае бензін.**

Састаў накіроўваўся з расійскага горада Каўчук у Калінінград. Атрымаць бензін павінен Калінінградскі марскі рыбны порт.

На момант падрыхтоўкі навіны было вядома, што цеплавоз адбуксіраваў аварыйную цыстэрну на запасны пуць станцыі «Орша-Кантэйнерная». Спецыялісты перапампавалі бензін у іншую цыстэрну. Састаў вырашылі адправіць у пункт прызначэння без аварыйнай цыстэрны.

### СУЖЫЦЕЛІ РАЗАМ ЗАГІНУЛІ ПРЫ ПАЖАРЫ

**У горадзе Новалукомль Чашніцкага раёна ўвечары, а дзясятай гадзіне, гарэла кватэра ў пяціпавярховым цагляным доме. Два чалавекі загінулі.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным упраўленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, у выніку гэтага пажару ў аднапакаёвай кватэры на пятым паверсе загінулі сужыцелі — 41-гадовая гаспадыня і яе 48-гадовы мужчына. Абодва — беспрацоўныя.

З пятага і чацвёртага паверхаў выратавальнікі эвакуявалі іх 11 суседзяў. Вызначана папярэдняя прычына пажару — неасцярожнасць загінулых пры курэнні ў нецвярозым стане.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ВЫПАЛА З МАШЫНЫ

**На паввароце ў в. Аса Кобрынскага раёна з аўтамашыны «УАЗ-3303» выпала жыхарка в. Клетышчы: вадзіцель, мясцовы жыхар, рэзка павярнуў, і дзверцы кабіны адчыніліся.**

40-гадовая жанчына атрымала цяжкія пашкоджанні і памерла ў бальніцы.

### ГРОШЫ ЁСЦЬ, А СЭКСУ НЯМА

**Беспрацоўны жыхар Брэста заявіў у міліцыю, што яго ашукаў невядомы.**

Ноччу каля кавярні «Казка» 42-гадовага мужчыну пацягнула на сэкс. Пасярэднікам выступіў рабочы аднаго ААТ, які паабяцаў за 40 долараў пазнаёміць з дзяўчынай. Узяўшы грошы, зводнік пра сваё абяцанне забыў.

Ашуканец затрыманы.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## АЗОНАВАЯ ДЗІРКА НАЗІРАЛАСЯ НАД БЕЛАРУССЮ НА МІНУЛЫМ ТЫДНІ

**Азонавую дзірку назіралі на мінулым тыдні над тэрыторыяй Беларусі вучоныя Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы Белдзяржуніверсітэта, паведаміў БЕЛТА дырэктар цэнтра Аляксандр КРАСОЎСКІ.**

Азонавая дзірка зарэгістравана над нашай краінай 26 кастрычніка, утрыманне азону ў атмасферы ў гэты дзень было прыкладна на 15 % ніжэйшым за норму. «Гэта ўтрыманне бяспечнае для здароўя чалавека, азонавая дзірка была бясшкоднай, таму што сонца цяпер знаходзіцца нізка над гарызонтам», — адзначыў вучоны. Цяпер азонавая дзірка змясцілася з тэрыторыі Беларусі. Часцей за ўсё азонавыя дзіркі ў краіне можна назіраць у канцы вясны — пачатку лета, а таксама напярэдадні зімы.

Азонавы слой абараняе ўсё жывое на Зямлі ад небяспечнага ўльтрафіялетавага выпраменьвання сонца. Калі б можна было здабыць увесь азон, што знаходзіцца ў атмасферы пад нармальным ціскам, то ў выніку выйшаў бы слой, які пакрывае паверхню Зямлі таўшчынёй усяго 3 мм. Калі гэты слой пачынае разбурацца, утвараецца азонавая дзірка. Паветраныя масы могуць перамяшчаць яе, таму такую дзірку ў розны час могуць назіраць адразу ў некалькіх краінах.


**ФИЛИАЛ ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 11 ноября 2009 г. в 10.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 состоится ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «ФанДОК» в составе Лота № 1:**

| Наименование имущества | Капитальное строение с инвентарным номером 714/С-21096 (здание магазина) общей площадью 185,3 кв.м |
|---|---|
| Адрес | Могилевская обл., Осиповичский р-н, Гродзянский с/с, д. Гродзянка, ул. Хатько, д. 23 |
| Организатор торгов | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» (р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509), г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 |
| Начальная цена продажи, рублей без учета НДС | 61 358 400 |
| Размер задатка, руб. | 3 067 920 |
| Номер р/с для перечисления задатка | Получатель платежа ОАО «ФанДОК» – р/с 3012000000377 в ОАО «Беларусбанк» г. Бобруйска, филиал 703, код 760, УНП 700060473 |
| Площадь зем. участка, га | 0,0552 га. Кадастровый номер 724880601601000347. Правовой режим – право постоянного пользования |
| Условия продажи | Аукцион без условий |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Условия оплаты | По договоренности Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи |
| Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка | По 10 ноября 2009 г. с 8.30 до 17.30 |

*Более подробная информация об условиях участия в аукционе, характеристиках продаваемого имущества, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» № 169 от 09 сентября 2009 г.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: **8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06** в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

**ФИЛИАЛ ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 16 ноября 2009 г. в 10.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 состоится ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Журавинка» в составе Лота № 1:**

| Наименование имущества | Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-59234 (здание мини-кафе) общей площадью 43,3 кв.м |
|---|---|
| Адрес | Могилевская обл., г. Бобруйск, п. Еловики, д. 1а |
| Организатор торгов | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» (р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509), г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 |
| Начальная цена продажи, рублей без учета НДС | 66 617 880 |
| Размер задатка, руб. | 6 661 788 |
| Номер р/с для перечисления задатка | Получатель платежа ОАО «Журавинка» – р/с 3012790150019 в ОАО «Белинвестбанк» отделении № 831 г. Бобруйск Головного филиала по Могилевской области, код 153801712, УНП 700067623, ОКПО 14775616 |
| Площадь зем. участка, га | 0,0418 га. Кадастровый номер 741000000003000926. Правовой режим – право постоянного пользования |
| Условия продажи | Аукцион без условий |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Условия оплаты | По договоренности Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи |
| Срок подачи документов, осмотра объекта и внесения задатка | По 13 ноября 2009 г. включительно |

*Более подробная информация об условиях участия в аукционе, характеристиках продаваемого имущества, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе опубликована в газете «Звязда» № 181 от 25 сентября 2009 г.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: **8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06** в рабочие дни с 8.30 до 17.30.



**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**ООО «СИ-трейдинг» на строительство жилого дома № 7 (типовых потребительских качеств) по г/п в микрорайоне № 1 жилого района «Копище» в Минском районе**

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг». Зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: 223053, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, р-н д. Боровая, д. 1, каб. 403, пересечение Логойского тракта и МКАД, телефон/факс 237 94 03;

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 18.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

В течение предыдущих трех лет организацией строительство не осуществлялось.

**Информация о проекте строительства:**

